# ФІЛАСАФІЧНАСЦЬ ЯК АДМЕТНАЯ РЫСА ТВОРЧАСЦІ ПРАДСТАЎНІКОЎ «ФІЛАЛАГІЧНАГА ПАКАЛЕННЯ»

**Дамброўская Н.М.**

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна

Мастацкі стыль пісьменнікаў-«шасцідзясятнікаў» вызначаецца рысамі лірыка-медытатыўнага, філасофска-аналітычнага пісьма. Праз паказ суб’ектыўнага, пачуццёва-канкрэтнага мастакі слова ўзнімаюцца да адлюстравання ўсеагульнага і, наадварот, з дапамогай абагульнення выходзяць на адметнасць адзінкавых з’яў. Пісьменнікі адлюстроўваюць шматмернасць чалавечага быцця ў дыялектычнай узаемаабумоўленасці часовага і вечнага, знешняга і ўнутранага.

У сваіх творах І. Пташнікаў, М. Стральцоў і В. Адамчык імкнуцца перадаць хуткаплыннасць жыцця чалавека, закрануць іншыя экзістэнцыйныя праблемы. Пісьменнікі асэнсоўваюць час як філасофскую катэгорыю, існаванне чалавека на зямлі, яго быцця ў сусвеце. У вершы-споведзі, вершы-прароцтве са зборніка «Ядлоўцавы куст» (1973) Стральцоў-філосаф вядзе размову з часам: «Прыходзіць пара, настае той час, / І вось ужо я вывяраю і мераю / Табою сябе – мой уладны Час – / Тваёю, пакутна здабытаю мераю / Спасцігнуць усё праз цябе я хачу, / Табою маё ўсё няхай апякуецца. / Знай пункты гульні. / А паруш – закрычу, / Аж голас у веку наступным пачуецца» [1, с. 354]. «Шасцідзясятнікам» уласціва абвостранае адчуванне часу, разуменне драматызму неадпаведнасці часу чалавечага і часу касмічнага, вечнасці. У гэтым плане аўтары працягваюць традыцыі Ф. Дастаеўскага, І. Буніна, К. Чорнага, М. Пруста, У. Фолкнера.

Аўтарскі роздум аб самым істотным у жыцці, аб вечным, аб жыцці і смерці, сутнасці і сэнсе зямнога існавання чалавека выконвае дамінантную зместавую «ролю» ў апавяданні «Смаленне вепрука», аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» М. Стральцова. Побытавыя, звычайныя дэталі на фоне драматычных абставін набываюць сімволіка-філасофскае гучанне і ўзмацняюць драматызм аповесцей І. Пташнікава «Тартак» і «Найдорф». Вобразны рад быційна-анталагічных пачаткаў

створаны і В. Адамчыкам у адным з эпізодаў тэтралогіі. Гэты рад «поле – жыта – маці (жанчына) – дзіця» тлумачыцца наступным чынам: поле родзіць хлеб падобна да таго, як маці нараджае дзіця – новы колас на ніве жыцця, новае зерне ў жыццёвай баразне. І ў першым, і ў другім выпадку гаворка ідзе пра вечнасць жыцця, якая дасягаецца вялікімі намаганнямі, мае высокі кошт.

Асаблівай духоўнай засяроджанасцю, філасофскім асэнсаваннем свету пазначаны і многія творы В. Адамчыка. Сярод медытатыўных апавяданняў В. Адамчыка ўмоўна можна вылучыць медытатыўна-выяўленчыя і медытатыўна-апавядальныя. Медытатыўна-выяўленчыя апавяданні («Жывая вада», «Пах летняй травы», «Аптэка нумар тры», «Маладзіковая нядзелька», «Сцежка на расходніку» і інш.) займаюць у творчасці празаіка колькасна большае месца. Яны заключаюць у сабе самааналіз, эмацыянальную і філасофскую рэфлексію. Лірычнае перажыванне ў іх «суправаджае» думкі мастака слова, накіраваныя ў глыбіню самога сябе альбо на падзеі знешняга свету. Лірычная медытацыя часта падае вельмі багаты і разнастайны ўласна пісьменніцкі свет і свет героя на аснове прадметнай выяўленчасці. У медытатыўна-выяўленчых творах уласна выяўленчы «бок» складваецца з прадметных рэалій аб'ектыўнага знешняга свету, якія становяцца асновай эмацыянальных роздумаў суб'екта. Многія дэталі слоўнай вобразнасці ў такім разе іншасказальныя і, метафарычна выражаючы складаны ўнутраны свет лірычнага суб'екта, служаць сродкам раскрыцця яго душэўнага стану.

Медытатыўна-апавядальныя творы з «прыхаваным» медытатыўным падтэкстам («Ці ён адзін?..», «Вочы поўныя жыцця і страху», «Альціст з мястэчковай аркестры», «Трывушчая» і інш.) – знешне ўласна апавядальныя творы з выразна акрэсленым сюжэтам, медытатыўныя разважанні зведзены да мінімуму.

У глыбокі роздум аб чалавечай экзістэнцыі ператвараюцца ў прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення» многія пейзажна-побытавыя замалёўкі, якія выконваюць ролю імпульсаў мастацкай думкі, дапамагаюць фарміраваць абвостраную, пільную ўвагу пісьменнікаў да рэчаіснасці, да людзей, якія ў ёй

фігуруюць. Творчая трансфармацыя ўражанняў мастакоў слова паводле асэнсавання фактычнага матэрыялу адбываецца, аднак, не толькі дзякуючы спасціжэнню іх уласным жыццёвым вопытам, але і дзякуючы майстэрству ўбачыць і падаць звычайнае, штодзённае ў нязвыклым ракурсе, падвысіць да ўзроўню эстэтычна значнага, вартаснага.

Светапогляд пісьменнікаў-«шасцідзясятнікаў» вызначаецца рухам ад асэнсавання быту да глыбіннай ацэнкі быцця. Часовае і вечнае, хуткацечнасць і бясконцасць арганічна суіснуюць у творчасці мастакоў слова, а рэаліі рэчыўнага свету набываюць анталагічную значнасць. Уласны аўтарскі вопыт, суб’ектыўныя перажыванні, пачуцці, якія «высвечвае» псіхалагічная і біяграфічная памяць і выток якіх мае рэальную, канкрэтную часава-прасторавую лакалізацыю, у працэсе трансфармацыі ў мастацкі вобраз трацяць эмпірычную адзінкавасць і набываюць значэнне універсальнага, усеагульнага.

**Литература**

1. Стральцоў, М. Выбранае : Проза, паэзія, эсэ / М. Стральцоў. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 607 с.